Год народнага адзінства

# ПАДАРУНАК І НАПАМІН




**У Выдавецкім доме «Звязда» ў пачатку верасня выходзіць філакартычны альбом «17 верасня. Дзень народнага адзінства» вядомага ў Беларусі і за яе межамі калекцыянера старых паштовак, лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», лаўрэата Прэміі Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро», сталага аўтара газеты «СБ. Беларусь сегодня», члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.**

Кніжнае выданне здзяйсняецца ў рамках творчага праекта «У пошуках страчанага» (адлік гэтай унікальнай ініцыятывы, якую і сёння працягвае рэалізоўваць на сваіх старонках газета «СБ. Беларусь сегодня», — з пачатку 2000-х), у якім за многія гады ўбачыла свет каля трох дзясяткаў філакартычных альбомаў. Прэзентацыя выдання адбудзецца ў межах выстаўкі старых паштовак, іншых артэфактаў на тэму ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, якая пройдзе ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь у святочны верасnёўскі дзень.



Кавалерыйскія часці Чырвонай Арміі перапраўляюцца праз наведзены мост каля вёскі Забалоцце. Заходняя Беларусь. Верасень 1939 года.

— Многія гады, вандруючы па розных паселішчах краіны, уважліва аглядаючы гістарычны, краязнаўчы ландшафты розных рэгіёнаў краіны, — дзеліцца разважаннямі Уладзімір Аляксеевіч, — я не магу не звяртаць увагу на тое, якая шматканфесіянальная і шматнацыянальная наша краіна, як у ёй спалучаюцца і ў фармаце народных культур, і ў звычайным быце розныя адметнасці — і саміх беларусаў, і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. І рады, што на такім высокім узроўні дзяржаўнага свята выяўлена жаданне адзінства, кансалідацыі памкненняў усіх нацыянальнасцяў па агульнадзяржаўным руху, агульнадзяржаўным будаўніцтве. І вось, дзякуючы зборам са сваёй калекцыі, я вырашыў з дапамогай старых паштовак, старых перыядычных выданняў (рэпрадукцыям з іх таксама знайшлося месца ў кнізе) распавесці пра адзінства народа Беларусі, зафіксаваўшы ў асобных раздзелах і тое, як на тэрыторыях, раней падпарадкаваных Польшчы, ішло грамадскае, палітычнае, нацыянальнае жыццё беларусаў, якія былі першыя крокі савецкай улады ў Заходняй Беларусі восенню 1939 года, і пасля расказаць, што, у адрозненне ад прыгнятальнікаў, у Беларусі заўжды знаходзілася месца, пашыралася прастора для жыцця людзей розных нацыянальнасцяў. Так было і ў Мінску, так было на Гомельшчыне, у Віцебску і Полацку, так было і ў Магілёве, на Магілёўшчыне...



Баец Чырвонай Арміі распавядае жыхарам Баранавіч пра жыццё ў СССР. 1939 год.

Сапраўды, магчымасць угледзецца ў твары беларусаў, татараў, рускіх, яўрэяў, палякаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў прадастаўляюць старыя паштоўкі і іншы ілюстрацыйны матэрыял, ствараючы паўнавартасную карціну беларускага жыцця. Ужо неаднойчы ў перыядычным друку выказваліся думкі, прапановы пра тое, што з дапамогай візуальных сродкаў той багаты філакартычны масіў, сабраны Уладзімірам Ліхадзедавым, здольны ўплываць на вырашэнне выхаваўчых і ідэалагічных задач. Калекцыянер за апошнія два дзесяцігоддзі здолеў правезці па краіне многія выстаўкі паштовак, якія расказваюць пра Беларусь як пра краіну, пра адвечныя памкненні беларусаў да суверэнітэту, дзяржаўнасці. «У пошуках страчанага» — з праектаў, якія маюць «доўгатэрміновую» зацікаўленасць грамадства, і гэта нельга не ўлічваць у арганізацыі выхаваўчай работы ў школе, ВНУ краіны.

**Раман СЭРВАЧ.**

**Ілюстрацыі з кнігі У. Ліхадзедава «17 верасня. Дзень народнага адзінства».**



Пінск. На прыёме ў старшыні часовага гарадскога кіравання. 1939 год.

# КУРС МАЛАДОГА БАЙЦА

## Ён стартаваў для першакурснікаў універсітэта МНС

**Вучэбна-лагерны збор першакурснікаў пачаўся ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС у Мінску і яго гомельскім філіяле. Ён будзе доўжыцца да канца жніўня.**

Асноўная мэта — увядзенне ў будучую спецыяльнасць. На працягу трох тыдняў больш за 170 першакурснікаў пазнаёмяцца з гісторыяй пажарна-выратавальнай справы Беларусі і ўніверсітэта МНС, вывучаць прававыя асновы дзейнасці органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, а таксама асновы страявой падрыхтоўкі. Асаблівая ўвага будзе аддавацца заняткам па фізічнай і аварыйна-выратавальнай падрыхтоўцы.

У рамках грамадзянска-патрыятычнага выхавання першакурснікі факультэта тэхнасфернай бяспекі з Мінска наведаюць гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна» і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама іншыя значныя гісторыка-культурныя аб'екты Беларусі.

Для першакурснікаў інжынернага факультэта прадугледжана экскурсія па Гомелі, наведванне абласнога музея ваеннай славы, а таксама іншых помнікаў гісторыі Вялікай Айчыннай. Курсанты возьмуць удзел ва ўрачыстым мерапрыемстве на мемарыяльным комплексе «Партызанская крынічка», што прымеркавана да 80-годдзя ўтварэння партызанскага атрада «Бальшавік». Таксама прадугледжана наведванне басейна, цэнтра бяспекі і вяровачнага гарадка Ліцэя МНС.

Курс маладога байца завершыцца 11 верасня ў Мінску прынясеннем першакурснікамі прысягі на плошчы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «БААЗ», Брестская обл., г. Барановичи, ул. Гагарина, 62** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства, спецтехника бывшие в употреблении**
**Местонахождение: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Гагарина, 62**

| № лота | Наименование | Год выпуска | Инв. № | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль MAZ 6303, рег. знак АК 2607-1** | - | 7773 | **8 628,00** |
| 2 | **Автомобиль SKODA SUPERB, рег. знак 1IPT 0562** | 2010 | 7805 | **12 528,00** |
| 3 | **Прицеп MAZ 837810, рег. знак АА 5501-1** | 2009 | 7803 | **9 000,00** |
| 4 | **Микроавтобус MAZ-182010, рег. знак 1ICT 1517** | 2012 | 7819 | **14 280,00** |
| 5 | **Автомобиль MAZ 543205-226, рег. знак 1ICT 1516** | 2010 | 7807 | **8 280,00** |
| 6 | **Автомобиль MAZ 543205-226, рег. знак 1ICT 1519** | 2010 | 7806 | **8 160,00** |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение 3 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.09.2021 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **16.09.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

Добрая навіна

# Жнівеньскія чытанні стартуюць у бібліятэках Магілёва

**У бібліятэках Магілёва з 20 па 30 жніўня пройдуць Жнівеньскія чытанні «Бібліятэка&Школа: ёсць вынік», паведаміла загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦГБ імя К. Маркса Алена ШЭПЕЛЕВА.**

«Традыцыйна напярэдадні новага навучальнага года бібліятэкі горада запрашаюць педагогаў, бацькоў, студэнтаў і навучэнцаў на Жнівеньскія чытанні. Гэта своеасаблівыя інфармацыйна-асветніцкія мерапрыемствы ў дапамогу адукацыйнага працэсу. Сёлета яны будуць праходзіць як у рэжыме анлайн, так і ў рэальным жыцці», — адзначыла Алена Шэпелева.

Адным з мерапрыемстваў стане прамаакцыя, дзе педагогі, навучэнцы і студэнты будуць мець магчымасць не толькі наведаць інтэлектуальныя пляцоўкі і метадычныя гасціныя, але і прыняць удзел у розных інтэрактыўных конкурсах і гульнях, пазнаёміцца з афішай маючых адбыцца мерапрыемстваў, атрымаць пакет карыснай інфармацыйнай прадукцыі.